# РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ МЕНТАЛЬНЫХ ХАРАКТАРЫСТЫК БЕЛАРУСКАГА НАРОДА Ў МОВЕ ПАЭЗІІ РЫГОРА БАРАДУЛІНА

***Кучарава В.В.,***
*студэнтка 4 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Гарагляд А.М., канд. філал. навук, дацэнт

Сучасны свет ставіць перад нацыямі задачу захавання і развіцця сваёй ідэнтычнасці. Разуменне нацыянальнага менталітэту, яго каштоўнасцей і асаблівасцей з'яўляецца ключом да паспяховага развіцця кожнага народа. У гэтым канцэксце паэтычная спадчына Рыгора Барадуліна як адлюстраванне беларускай духоўнасці і нацыянальнага характару набывае асаблівае значэнне.

Актуальнасць даследавання вызначаецца неабходнасцю дэталёвага вывучэння аспектаў узаемасувязі мовы і культуры, што абумоўлена антрапацэнтрычнай накіраванасцю сучаснай лінгвістыкі. Мэтай нашага даследавання з'яўляецца выяўленне нацыянальна-культурнай спецыфікі моўных сродкаў рэпрэзентацыі ментальных характарыстык беларускага народа ў зборніку паэзіі Рыгора Барадуліна.

**Матэрыял і метады.** Даследаванне праведзена на матэрыяле мовы зборніка паэзіі Рыгора Барадуліна «Ксты». Асноўнымі метадамі даследавання выступаюць апісальны, культурна-гістарычны і метад навуковага назірання.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Для сучаснага беларускага менталітэту характэрна адсутнасць пачуцця перавагі над іншымі народамі. Само жыццё навучыла беларусаў думаць пра інтарэсы грамадства ў цэлым, а не толькі пра свае ўласныя. Цярплівасць, свабодалюбства, адвага і рашучасць беларусаў звязаныя з гістарычным мінулым нашага народа, насычаным войнамі і ваеннымі канфліктамі [1, с. 127].

Важнае значэнне маюць паважлівае стаўленне беларусаў да іншых поглядаў, пазіцый, культуры, імкненне да ўзаемапаважлівага суіснавання з прадстаўнікамі іншых нацый, канфесій, сацыяльных груп і г. д. Асноўнымі рысамі псіхалогіі беларусаў можна лічыць працавітасць, гасціннасць, шчырасць і патрыятызм.

Праца для беларусаў – гэта не толькі фізічная дзейнасць, але і сэнс жыцця, адданасць сваёй справе, адказнасць за свае дзеянні. Беларусы цэняць працу як сродак для асабістага развіцця, а таксама як спосаб абараніць сваю радзіму і забяспечыць сваю сям'ю.

*Да дня бяжыць прывітаць дзяннік / Пад самы ганак сцежка крывая. / Трэба, каб **земляроб-працавік** / Першы пакаштаваў **караваю*** [1, с. 65]. Лексічная адзінка *каравай* можа выкарыстоўвацца як сімвал працы, таму першы, хто павінен пакаштаваць каравай, – гэта земляроб.

Лексічная адзінка *праца* ўжываецца ў спалучэнні з рознымі прыметнікамі, якія характарызуюць светапогляд беларусаў. Так, у творах Р. Барадуліна мы сустракаем ***Вясёлая праца*** *– / За вецер трымацца* [1, с. 474] як паказчык душэўнага стану беларусаў; ***Нялёгкая праца, / Нялёгкаадольная праца*** – / Страх у сабе знябыць. / Бога не трэба баяцца – / Бога трэба любіць [1, с. 203] як паказчык цяжкага жыцця беларускага народа і важнасць веры ў сябе і ў Бога; *Так, жыццё – гэта свята Здаровага цела / І душы несуцешнай* ***дасконная праца*** [1, с. 460] як павага да жыцця, здароўя і працы; *У ціхай свячыцы* ***святая праца****, / Што свенціць свет / Незямным святлом. / Святло разгарыцца, / Каб мог спрачацца / Наш дух вячысты / З вачыстым злом* [1, с. 189] як сімвал разважання над духоўнай сілай і нязгаснай прыродай чалавечага духу.

Гасціннасць для беларусаў – гэта адзнака нацыянальнага характару, якая адлюстроўваецца ў падыходзе да гасцей. Беларусы цэняць гасціннасць як важную частку сваёй культурнай спадчыны. Гасціннасць беларусаў – гэта не толькі прыём у хаце, але і ўважлівасць, добрачыннасць і гатоўнасць дапамагчы. У сучаснай беларускай мове сінонімам да гэтага слова з'яўляецца *хлебасольства* [3, с. 117].

Рыгор Барадулін даволі метафарычна апісвае Беларусь як гасцініцу, дзе кожны госць павінен адчуваць сябе як дома.

Шчырасць – гэта яшчэ адна адзнака нацыянальнага характару беларусаў. Яны імкнуцца быць шчырымі ўсюды: на сцэне, у жыцці, у адносінах з іншымі. Гэта слова адлюстроўвае адданасць і прынцыпы, якія ляжаць ў аснове паводзін і ўзаемаадосін беларусаў з іншымі народамі. Так у Рыгора Барадуліна можна сустрэць словазлучэнне "шчыры беларус" – гэта горды за сваю краіну чалавек, які прагне захоўваць яе традыцыі і духоўную спадчыну.

*Лёсам, блізкім да Сына Свайго Ўлюбёнага. / Хто верыў, а хто камянямі кідаў. / Хто йшоў следам, а хто прадаваў яго. / І ўкрыжавалі на Галгофе часу. / І ўваскрос у кожным* ***шчырым беларусу*** [1, с. 240].

У Рыгора Барадуліна паняцце "патрыятызм" – гэта гонар за дасягненні і культуру сваёй Радзімы, жаданне захоўваць яе культурныя асаблівасці і ідэнтыфікаваць сябе з іншымі прадстаўнікамі свайго народа, імкненне абараняць інтарэсы радзімы і сваіх землякоў.

Аналіз вершаў Р. Барадуліна сведчыць, што ў мастака слова існуе падзел прасторы на "сваю" і "чужую", прычым "свая" тэрыторыя – гэта часцей родная хата, а чужая – тэрыторыя за яе межамі.

*І зноў я на гады багаты. / Пра шлях той думаю радзей. / І камары ля* ***роднай хаты*** */ Кусаюць неяк саладзей...* [1, с. 399].

*Не мяняй* ***свой куток*** *на прастору чужую, / У прасторы чужой птушка гнёзды не ўе* [1, с. 56].

Неаднаразова патрыятызм аўтара адлюстраваны ў яго паэтычнай мове праз такія словазлучэнні, як *бацькоўская зямля, бацькоўская хата*:

***Зямля бацькоўская*** *радасцю прывячае. / І ўбачыўшы, як пастарэла радня, / Адчуеш, які ты стары – да адчаю* [1, с. 470].

*З* ***бацькоўскай хаты*** */ Ад'язджаем кожны раз / З надзеяй зноў ступіць / На ціхі ганак* [1, с. 376]. Гэты радок адлюстроўвае пачуцце і еднасць з роднымі мясцінамі. Зямля, на якой мы нарадзіліся, застаецца ў нашых сэрцах і прыносіць радасць.

**Заключэнне.** Вывучэнне моўных сродкаў, у якіх рэпрэзентуюцца ментальныя характарыстыкі, з'яўляецца важным і неабходным для ўсведамлення ідэйнага сэнсу мастацкіх тэкстаў і для разумення творчай асобы пісьменніка, дае магчымасць атрымаць уяўленне пра яго ўнутранае духоўнае жыццё, сістэму каштоўнасцей, карціну свету як мастака слова, так і нацыі, да якой належыць творца.


1. Дубянецкі, Э. Менталітэт беларусаў: спроба гістарычна-псіхалагічнага аналізу / Э. Дубянецкі // Беларусіка. – Мінск: Нацыянальны навукова-асветны цэнтр імя Ф. Скарыны, 1993. – Кн. 2. – С. 438.
2. Барадулін, Р. Ксты / Р. Барадулін. – Мінск: Рым.-катал. Парафія св. Сымона і св. Алены, 2006. – 528 с.
3. Мажэйка, Н.С. Частотны слоўнік беларускай мовы / Н.С. Мажэйка. – Мінск: Зоркі гор, 2006. – 658 с.


## ГЕНЕЗИС И ТРАНСФОРМАЦИЯ ОБРАЗА ОТЦА В ТВОРЧЕСТВЕ АНДРЕЯ ТАРКОВСКОГО


***Ледяев С.А.,***

*студент 4 курса ГГТУ, г. Орехово-Зуево, Российская Федерация*

Научный руководитель – Роман С.Н., канд. филол. наук, доцент


В настоящее время существует множество статей и диссертаций, исследующих творчество Андрея Тарковского. Работы режиссёра поражали современников своей смелостью и глубиной. Все фильмы Андрея Арсеньевича детально иллюстрируют глубины человеческой натуры, раскрывают вечные проблемы познания и веры. Актуальность работы обусловлена повышенным интересом к творчеству Тарковского.